**Фёдарава, Л.** Ты з намі, салдат! / Л. Фёдарава // Дзвінская праўда. — 2009. — 13 лют. — С. 1.

## ТЫ З НАМІ, САЛДАТ



– Няма большага гора ў жыцці, чым хаваць сваіх дзяцей, – гаворыць Майя Сяргееўна Шэўчанка з Росіцы. Яна выплакала ўсе вочы па сваім сыне, які загінуў у Афганістане. З той пары мінула 27 гадоў, але ў сэрцы маці – несціхальны боль. Яна прыходз1ць на магілу сына, размауляе з ім як з жывым.

І удзячна, што памяць аб «яе хлопчыку» жыве у родным краі. Пакуль у вёсцы была школа, піянерская дружына насіла імя Міхаіла Шэўчанкі. Зараз вучні Сар'янскай СШ, якія жывуць у Росіцы, па-ранейшаму шэфствуюць над магілай героя.

У апошнія хвіліны жыцця сяржант Шэўчанка здзейсніў подзвіг: ратуючы таварышаў, абясшкодзіў міну і загінуў пад агнём душманаў. Юнак мог не ўдзельнічаць у той аперацыі, бо ўжо атрымаў «дзембельскія» дакументы. Але сам папрасіўся, вырашыў дапамагчы нявопытнаму сапёру-навічку...

– А ці змог бы я так? – задаюць сабе пытанне сённяшнія юнакі-прызыўнікі – равеснікі і землякі Мішы. Ганарацца ім, старанна рыхтуюць сябе да армейскай службы. У школе памяці воіна прысвячаюцца ўрокі мужнасці. Сёння ў Росіцкім клубе пройдзе інтэгрыраваны ўрок гісторыі і геаграфіі на тэму «Зноў трывожыць душу памяць аб табе, Афганістан». Вучні Сар'янскай школы з настаўніцай А. І. Мінчанка падрыхтавалі матэрыял пра гісторыю Афганістана, запрасілі на гэтую сустрэчу-рэквіем былых воінаў-афганцаў – камісара райваенкамата Ю. Венгера, старшыню савета раённай арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў А. Шыманскага, рабочых СП «Дрысенскі»

І. Кротава і М. Войніча. Каб людзі, і асабліва моладзь, паслухалі іх расповед аб падзеях тых далёкіх часоў.

Мінулі два дзесяцігоддзі, як савецкія войскі пакінулі Афганістан. Па-рознаму можна ўспрымаць тую вайну. Але былым яе салдатам за ратны подзвіг мы аддаем даніну павагі і памяці.

І кладуць на магілу Мішы Шэўчанкі кветкі росіцкія маладажоны. І прысвячаецца памяці героя-земляка лыжны крос росіцкіх рабят, пераможцам якога ўручае свае прызы (гадзіннікі, калькулятары) Майя Сяргееўна Шэўчанка. Бачыць у гэтых рабятах прадаўжэнне свайго сына.

**Л. Фёдарава**

**НА ЗДЫМКУ: М. С. Шэўчанка прыйшла да сына**

**Фота Валерыя Салаўёва**